4. Официальный аккаунт СМИ/Новостная компания Washington Post в Вашингтоне [Электронный ресурс] / Официальный аккаунт Washington Post. – Минск, 2017. – Режим доступа: https://www.washingtonpost.com/news/worldviews/wp/2017/01/14/europes-last-dictatorship-has-a-new-plan-tourism/?utm_term=.012928f0b54e. – Дата доступа: 22.01.2017.

## ДЫНАМІКА ЗМЕН ЛІТОЎСКАГА ІМПАРТУ ТАВАРАЎ У БЕЛАРУСЬ (1997–2004 гг.)

**Русаковіч У.М.,**
аспірант кафедры міжнародных адносін БДУ, м.г.н.

За першы год разгледжанага перыяду, то бок за 1997 г., літоўскі імпарт у Беларусь склаў $191,919 млн, або 6,68 % агульнага імпарту Беларусі [1, с. 18-19]. Уступленне Беларусі ў мытны саюз з Расіяй паводле Пагаднення ад 6 студзеня 1995 г. і наступнае ўступленне Літвы ў Еўрапейскі Саюз 1 мая 2004 г. істотна змянілі склад літоўскага імпарту ў Беларусь паводле асноўных таварных груп, як і іх памеру. У 2004 г. імпарт з Літвы скараціўся як у абсалютных лічбах на 9,3 % да $175,592 млн, гэтак і ў адносным вылічэнні. Доля Літвы ў агульным імпарце Беларусі скарацілася да 3,81 % [2, с. 60]. Калі на 1997 г. налічвалася 42 асноўныя таварныя групы літоўскага імпарту ў Беларусь [1, с. 110-112], то да 2004 г. іх засталося 16 [2, с. 213-214]. За разгледжаны перыяд са спісу літоўскага імпарту выбылі 30 асноўных таварных груп: шакалад і прадукты з утрыманнем какава; нафтавыя газы; патака (мелес); часткі для рухавікоў унутранага згарання; лекі; нафтапрадукты; раслінны корм для жывёл; цыклічныя вуглевадароды; ацыклічныя спірты; баваўняна-папяровая пража; паветраныя і вакуумныя насосы; апараты для пайкі; прылады апрацоўкі і ўпакоўкі тавараў; няпорыстыя пліты, лісты, стужкі, фольга і палосы з пластмасы; часткі для вадкасных насосаў; апаратура для вымярэння выдаткоўвання і ўзроўню ціску вадкасці і газа; альдэгіды; тканіны з сінтэтычных валокнаў; аміяк; шклатара; электрычныя рухавікі і генератары; мароженая рыба; масла; санітарна-тэхнічнае абсталяванне з чорных металаў; вырабы з цэменту, бетону і штучнага каменя; шматслойныя і немелаваныя папера і кардон у рулонах і аркушах; гатовыя і кансерваваныя прадукты з рыбы; фруктовыя і гароднінныя сокі; мука і гранулы з мяса і мясных субпрадуктаў. Усе пералічаныя тавары зніклі з літоўскага імпарту ў Беларусь без замены адпаведнікамі з іншай сыравіны або іншага ўзроўню яе апрацоўкі. Выбылыя таварныя групы складалі $46,868 млн літоўскага імпарту ў Беларусь, або

24,4 % яго памеру. Сярод выбылых тавараў найбольшую долю ў 15,6 % складаў шакалад і прадукты з утрыманнем какавы – $7,319 млн, або 3,8% ад агульнага імпарту Літвы ў Беларусь [1, с. 110].

У 2004 г. 5 новымі таварнымі групамі параўнальна з 1997 г. сталі: ячмень; тыпаграфская фарба, чарніла і туш для пісьма; хатняя жывая птушка; драўнянастружкавыя пліты; шлакавата. Новыя таварныя групы склалі $24,331 млн літоўскага імпарту ў Беларусь за 2004 г., або 13,9 % яго памеру. Такім чынам, новыя тавары замянілі крыху больш за палову (57 %) долю выбылых з 1997 г. тавараў, што і адлюстравалася ў адпаведным скарачэнні імпарту з Літвы. Варта адзначыць, што адзін ячмень склаў $13,671 млн (7,1 %) літоўскага імпарту ў Беларусь, або 56,2 % імпарту новых тавараў [2, с. 213].

У ходзе рознанакіраванай інтэграцыі Беларусі і Літвы 11 таварных груп захавалі сваю прысутнасць у літоўскім імпарце ў Беларусь. Аб'ём імпарту пяці з іх вырас насуперак скарачэнню агульнага аб'ёму імпарту з Літвы ў Беларусь з 1997 г. па 2004 г. Такімі таварнымі групамі былі: пшаніца, імпарт якой вырас з $18,055 млн (9,4 % агульнага аб'ёму імпарту) да $32,84 млн (18,7 %); корм для жывёл (што ўлучае жывёльныя складнікі) – з $5,843 млн (3 %) да $9,084 млн (5,2 %); сельскагаспадарчыя машыны для ўборкі і абмалоту – з 1,729 млн (0,9 %) да 5,725 млн (3,3 %); тара з паперы і кардона – з 2,558 млн (1,3 %) да 4,214 млн (2,4 %); пластмасавая тара – з 0,373 млн (0,2 %) да 2,151 млн (1,2 %). Пагатоў электраэнергія з Ігналінскай АЭС захавала за сабой першае месца ў літоўскім імпарце ў Беларусь. Разам з тым, яе пастаўкі скараціліся з $54,019 млн у 1997 г. да $42,285 млн у 2004 г., што прывяло да падзення долі электраэнергіі ў літоўскім імпарце ў Беларусь з 28,1 % да 24,1 % [2, с. 213-214].

Такім чынам, у прамежку з 1997 па 2004 г. таварная разнастайнасць літоўскага імпарту ў Беларусь звузілася больш як у 2,5 разу (калі быць дакладным у 2,625 разу). Адначасна яго доля ў агульным імпарце Беларусі скарацілася больш як на 75%. У якасці асноўнага чынніка спаду літоўскага імпарту ў Беларусь варта лічыць удзел Беларусі і Літвы ў розных мытных саюзах. З уплыву дадзенага чынніка вынікае знікненне 30 з 42 таварных груп літоўскага імпарту без іх замены адпаведнікамі, што адбылося ў выніку абкладання мытам. Названая перамена найперш закранула харчаванне і лекі, вырабы хімічнай прамысловасці і машынабудавання. Усе 5 новых таварных груп тычыліся новых галін гандлёва-эканамічнай супрацы Беларусі і Літвы. Гэтак ячмень пастаўляўся на піўныя бровары Беларусі. Тыпаграфская фарба – адпаведна на патрэбы друкарняў. Хатняя жывая птушка – для забеспячэння патрэб птушкагадоўлі Беларусі. Страту выбы-

лых таварных груп удалося кампенсаваць толькі на палову за кошт росту паставак тавараў з іншай сыравіны і іншага ўзроўню яе апрацоўкі. Пшаніца часткова пакрыла попыт на іншыя крыніцы сыравіны для камбікармоў, такія як патака (мелес) і мука і гранулы з мяса і мясных субпрадуктаў. Корм для жывёл з выкарыстаннем жывёльных складнікаў пашырыў сваю долю за кошт знікнення паставак раслiннага корму. Тара з паперы і кардона ў якасці гатовага вырабу стала шырэй пастаўляцца замест шматслойных і немелаваных паперы і кардону ў рулонах і аркушах.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

1. Внешняя торговля Республики Беларусь за 1995-1998 годы. — Мн. : Информстат Минстата Респ. Беларусь, 1999. — 141 с.
2. Внешняя торговля Республики Беларусь, 2005 (Стат. сб.) / редкол.: В.Г. Михно (председатель). — Минск : Минстат Республики Беларусь, 2005. — 280 с.

## БОРЬБА ЗА СИРИЮ В КОНТЕКСТЕ КОНЦЕПЦИИ «БОЛЬШОГО БЛИЖНЕГО ВОСТОКА»

**Саллум Ферас,**
старший преподаватель факультета международных отношений БГУ, к.и.н.

Большой Ближний Восток представляет собой географическую дугу, простирающуюся от Западной Сахары до провинции Аль-Билинис в Пакистане. Со времени ухода Франции и Великобритании с Ближнего Востока и открытия там нефтяных промыслов, США стремились усилить контроль над ресурсами в этом регионе, обеспечить транспортировку нефти к берегам Средиземного моря через Сирию, обеспечить безопасность Израиля, а также проводили политику сдерживанию советского влияния путем создания альянсов с прозападными исламскими странами. Для достижения этой цели западные государства использовали межарабское соперничество за лидерство в регионе между Саудовской Аравией, Египтом, Иорданией и Ираком. Советский Союз, в свою очередь, с начала холодной войны, стремился укрепить свои позиции на Ближнем Востоке посредством распространения идей социализма, борьбы против империализма и советской военной помощи, предоставляемой арабским странам. В этих условиях, Сирия, проводя независимую политику, основанную на общеарабском национализме, социалистической экономической политике, отказе от западного влияния и сближении с СССР, стала полигоном борьбы между западным лагерем во главе США и восточным лагерем во главе СССР.